2.Белорусская этномузыкология: очерки истории (XIX – XX вв.) / З. Можейко, Т. Якименко, Т. Варфоломеева и др. ;под.ред. З. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1997. – 254 с.

3.Говард М. Сучасная культурная антрапалогія. – Мінск. : Тэхналогія, 1995. – 478 с.

4. Камінскі А.Я. Рэжысура традыцыйнага абраду : вуч.-метад. дапам. – Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, 2009. – 112 с.

5. Можейко З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт систем.-типол. исслед. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.

6. Можейко З.Я. Экология традиционной народно-музыкальной культуры: нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем. – Минск: Беларус. навука, 2011. – 147 с.

7. Музыка. Беларускі музычны фальклор // Учебные программы факультативных занятий. VI – XI классы. 2016 год // Национальный образовательный портал [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.adu.by/ru/uchitelyu/uchebno-metodicheskoe-obespechenie-doshkolnogo-obshchego-srednego-i-spetsialnogo-obrazovaniya/uchebnye-programmy-fakultativnykh-zanyatij-v-xi-klassy-2016-god.html. – Дата доступу: 12.02.2017.

8. Стрельцов Ю.А. Культурология досуга: учеб.пособие. – Москва : Просвещение, 2003. – С. 16 – 35.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНЫЯ МЕТАДЫ КУЛЬТУРНАЙ АНРАПАЛОГІІ ЯК КРЫНІЦА ВЫВУЧЭННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ І ФАЛЬКЛОРУ БЕЛАРУСІ

***(на прыкладзе антрапалагічных фільмаў Зінаіды Мажэйкі)***

***Дарашэвіч Э.К.,*** *прафесар*
*кафедры этналогіі і фальклору,*
*доктар філасофскіх навук,*
*прафесар*

Айчынная вышэйшая адукацыя, як і сістэмы адукацыі большасці краін постсавецкай прасторы, сёння знаходзіцца ў няпростым стане. Мне, як чалавеку, які ўпершыню пераступіў парог універсітэцкай аўдыторыі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя (як студэнт – у 1948, як выкладчык – у 1956 годзе), з далягляду ўласнага жыццёвага досведу гэта падаецца бясспрэчным.

Па-першае, здзіўляе новая формула ў кодэксе аб адукацыі, што універсітэты, як адукацыйныя ўстановы, павінны аказваць адукацыйныя паслугі. Адукацыя – не паслуга, а сутнасць і маральная аснова культуры як перадачы сацыяльнага досведу паміж пакаленнямі. Тут «краевугольным камнем» павінны з'яўляцца не паслугі, а выхаванне.

Па-другое, у XXI стагоддзі існуюць міжнародныя стандарты і рэйтынгі, у якіх дакладна вызначаны метады і узроўні выкладання, колькасць вучэбных дысцыплін для атрымання ўніверсітэцкага дыплому, сістэма адбору дысцыплін (абавязковых і т.зв. «дысцыплін

па выбары»). Гэта – апрабаваная сістэма, якая з’яўляецца прагрэсіўнай, іншая сістэма ў свеце пакуль не вынайдзена. Але – трэба памятаць, што міжнародныя стандарты варта творча пераасэнсоўваць і адаптаваць да здабыткаў і традыцый нацыянальных вышэйшых школ. Балонская сістэма гэта прадугледжвае і мае на ўвазе; але тыя, хто яе ўкараняе – што называецца,не заўсёды «ў курсе».

Па-трэцяе, што тычыцца савецкай адукацыі – трэба адзначыць, што яна мела шмат пазітыўнага, часам, абыходзіла заходнюю, але сёння ад яе амаль нічога не засталося (сутнаснага, навуковага і прагрэсіўнага, як і старых крыніц яе фінансавання, дарэчы). Гэта – аб’ектыўная рэчаіснасць XXI стагоддзя, незалежна ад таго: падабаецца нам гэта, ці не падабаецца.

Галоўны тэзіс сучасных дакладных і выніковых адукацыйных стратэгій: праблемы грамадства вырашае навука і прагрэс, а адукацыя павінна на іх арыентавацца. Калі навука ў загане – праблемы грамадства не будуць вырашаны. Там, дзе навука (і навуковыя падыходы да адукацыі) у занядбаным стане – нічога істотнага з сацыяльных праблем не будзе вырашана. Толькі навука дае прагрэс ва ўсіх сферах: ад Космаса да сельскай гаспадаркі, гэта – факт.

Сёння мы страцілі дасягненні савецкага перыяду, а заходнія (на якія арыентуецца большасць сучасных грамадстваў)не набылі. Мы саромемся сцвярджаць новыя (этнічнаарыентаваныя, арыентаваныя но новую дзяржаўнасць і сацыякультурную рэчаіснасць) прыярытэты ў адукацыі і выхаванні. Тыпалагічна гэта – маргінальны стан, стан, амаль вядучы да непісьменства. Па даследаваннях ЮНЭСКА: межы непісьменнасці і межы жабрацтва на карце свету супадаюць…

Сучасны стан айчыннай адукацыі абумоўлены комплексам прычын, і аб’ектыўных, і суб’ектыўных. Акрамя суб’ектыўных сацыякультурна-постсавецкіх – падзенне прэсціжу адукацыі і навукі на фоне «хуткіх» заробкаў ў бізнэсе і IT-сферы – ёсць і аб’ектыўныя, глабальныя. Сучаснае жыццё і выжыванне ў інфармацыйным грамадстве патрабуе вельмі шырокіх ведаў і метадалагічнай базы, якая дазваляе лёгка пераключацца на вырашэнне новых праблем і задач асобы, супольнасці, народа. Каб гэтага дасягнуць – трэбавыхоўваць крэатыўнасць, крытычнае мысленне і асабістую адказнасць як за свае дзеянні, так і за лёс свайго народа з маладосці, таму – мэтанакіравана рэфармаваць адукацыю з пачатковай школы. Аб’ектыўна бачна, што гэтага сёння няма, таму спадзявацца на хуткія эканамічныя і культурныя змены няма падстаў.

Павага да ўласнай культуры і дакладнае веданне яе – патрэба сучаснага грамадства. Пры падрыхтоўке спецыялістаў па вывучэнні і захаванні фальклору і народнай творчасці (ў чым і спецыялізуюцца шэраг спецыяльнасцей БДУКМ) на кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ некалькі год плённа выкарыстоўваецца патэнцыял антрапалагічных фільмаў вядомага айчыннага аўдыявізуальнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

антраполага і этнамузыколага Зінаіды Мажэйкі. На семінарскіх занятках па беларусазнаўчых дысцыплінах студэнты паралельна з зачытваннем паведамленняў і іх абмеркаваннем адглядаюць яе фільмы і робяць іх пісьмовы аналіз па прапанаванай форме. Эфект быў заўважны адразу: веды папоўніліся, студэнты сталі ставіцца да сваёй спадчыны са значна большай павагай, неаднаразова дзячылі кафедры за інавацыю і фарміраванне аб'ектыўнага погляду на фальклор Беларусі.

Мы прагнем камфорту і сучасных стандартаў жыцця і ставім сабе ў прыклад краіны Захада і Японію, якія, маўляў, узяўшы напрамак на няўрымслівую мадэрнізацыю, забыліся на традыцыяналізм, а таксама на нематэрыяльныя каштоўнасці і пошук сацыяльнай справядлівасці. Але ва ўніверсітэтатах Захада вывучаюць П. Абеляра, Р. Генона і… К. Маркса, а нібыта «глабальна» арыентаванае ЮНЕСКА са штаб-кватэрамі ў ЗША і Еўропе бярэ пад ахову нематэрыяльную культурную спадчыну розных народаў. Ёсць прыклады, калі культываванне народнага і аўтэнтычнага можа быць апірышчам імклівага развіцця эканомікі (напрыклад, японскі вопыт падтрымкі народнай творчасці галіны дробнай пластыкі вывеў Японію па відах прамысловасці, знітаваных з мікраэлектронікай, на першае месца ў свеце).

Асэнсаванне спадчыны традыцыйнай культуры, пошук форм яе інтэграцыі ў сучаснасць – актуальная тэарэтычная і практычная праблема для еўрапейцаў XXI стагоддзя, якія з увагай глядзяць на Усход, што дэманструе жыццяздольны сінтэз традыцый і мадэрнізму (Японія, Карэя, Кітай, Сінгапур, Індыя, Арабскія Эміраты), які вядзе ўсходнія нацыі да эканамічнага і культурнага дамініравання ў свеце. Элвін Тофлер у творах «Трэцяя хваля» і «Футуршок» [1, с. 210–214], адзначае: выйсце з культурнага крызісу Захаду – вяртанне да глыбіннай спадчыны яго культуры. Даследчык падкрэслівае, што такія інтэнцыі актуальныя нават у ЗША (краіне поліэтнічнай, чыя культура сфарміравана пераважна на аснове касмапалітызму і мадэрнізацыі) таму, што толькі традыцыі ўпарадкоўваюць інавацыі (колькасць якіх сёння сапраўды імкліва-бескантрольна нарастае) і толькі традыцыі здольныя паменшыць і ўтаймаваць «шок ад інавацый культуры», якім цалкам пранята мяжа XX і XXI стагоддзяў.

Сёння нематэрыяльная культурная спадчына – помнікі фальклору – запатрабаваны грамадствам на новым – глабалізацыйным – «вітку» яго развіцця. Фальклор вабіць увагу і вузкага кола даследчыкаў, і прадстаўнікоў буйных сацыяльных рухаў (традыцыяналістаў, футуролагаў, аматараў поп-арта і авангарда), якія часам паўстаюць і ў якасці вытворцаў ці спажыўцоў твораў мастацтва, заснаванага на традыцыйных формах. Найбольш паслядоўныя і ўдумлівыя аналітыкі шукаюць храналагічныя далягляды і генезіс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласнай традыцыйнай культуры, і антрапалагічныя фільмы тут – вельмі дзейсны і выніковы сродак.

1. Тоффлер, Э. Шок будущего / Э.Тоффлер / перевод на русский язык: А. Мирер, И. Москвина-Тарханова, В. Кулагина-Ярцева, Л. Бурмистрова, К. Бурмистров, Е. Комарова, А. Микиша, Е. Руднева, Н. Хмелик. — М.: Амфора, 2001. – 346 с.

## ПРАБЛЕМЫ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАГА ЗАСВАЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСЕННАЙ ТРАДЫЦЫІ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ КУРСАВЫХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

***Петухова Н.В.,*** *старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору, кандыдат педагагічных навук*

Даследаванне і прапаганда фальклору – найважнейшы спосаб спасціжэння скарбаў нацыянальнай культуры сучасным грамадствам. Для выканання гэтай пачэснай і складанай (ў наш глабалізаваны час) функцыі грамадства Беларусі забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў-беларусазнаўцаў для розных сфер сацыякультурнай дзейнасці. Але, перш чым пачаць даследаваць і прапагандаваць фальклор, яго трэба спачатку зафіксаваць падчас фальклорна-этнагарафічнай экспедыцыі. Экспедыцыя – адзін з галоўных сродкаў прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, сродак, які дазваляе паглыбіць і замацаваць атрыманыя на занятках тэарэтычныя веды і практычныя навыкі, пазнаёміць будучых фалькларыстаў-практыкаў з жывым бытаваннем фальклору, дапамагчы ім авалодаць першапачатковымі навыкамі збіральніцкай працы. Мы рыхтуем супрацоўнікаў устаноў культуры па спецыяльнасці «народная творчасць» з напрамкам «фальклор» [2], таму гэты этап іх адукацыі – вельмі істотны.

У буклеце, распрацаваным для абітурыентаў і іх бацькоў, якія цікавяцца прафесійнай падрыхтоўкай фалькларыстаў, пазначана: «Кафедральная мадэль падрыхтоўкі спецыяліста па фальклоры, якая забяспечвае захаванне ўзораў мастацтва вуснай традыцыі не мае аналагаў у іншых універсітэтах Беларусі. Палявая экспедыцыйная праца на першым курсе (вучэбная фальклорная практыка студэнтаў) з'яўляецца асновай кафедральнай дыдактычнай мадэлі падрыхтоўкі спецыялістаў па фальклоры:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ